## Змест


* * * Падымі угару свае вока ........ 5
* * * Ўчора шчасце толькі глянула нясмела ........ 7
Упалі з грудзей Пана Бога… ........ 8
Раманс ........ 10
Рандо ........ 13
* * * Вы так часта пазіралі ў люстру ........ 14
* * * Напілося сонца са крыніц сцюдзёных ........ 17
* * * У небе — ля хмары грымотнай ........ 19
Срэбныя змеі ........ 21
Возера ........ 22
Завіруха ........ 24
* * * Буду сніць і днямі, і начамі ........ 27
Вечар ........ 28

Бура ........ 30
Санет (* * * На цёмнай гладзі сонных луж балота) ........ 32
* * * Мудрай прамовы ........ 35
Трыялет (* * * Калісь глядзеў на сонца я) ........ 36
* * * Калі ў ракавіну цёмную жамчужніцы ........ 39
* * * Свяча бліскучая зіяе ........ 40
* * * Плакала лета, зямлю пакідаючы ........ 42
Трыялет (* * * Як птушка ў гібкіх трасніках) ........ 45
* * * Вось і ноч. Нада мной заліліся слязамі нябёсы ........ 46
Зіянне месяца ........ 48
Над возерам ........ 51
* * * Пралятайце вы, дні ........ 53







* * *

Падымі угару свае вока,
І ты будзеш ізноў, як дзіця,
І адыйдуць-адлынуць далёка
Ўсе трывогі зямнога жыцця.

Ціха тучу блакіт закалыша,
У душы адрасце пара крыл, —
Узляціць яна ў сінюю вышу
І ў струях яе змые свой пыл.

Там не трэба ні шчасця, ні ласкі,
Там няма ні нуды, ні клапот,
Ты — царэвіч цудоўнае казкі,
Гэта хмара — дыван-самалёт!



**Упалі з грудзей Пана Бога…**

Упалі з грудзей Пана Бога,
Парваўшыся, пацеркі зор.
Яны раскаціліся ў небе,
Усыпалі сіні прастор.

І гэтак маркотна і пільна
На край наш нядольны глядзяць…
Што ж чуюць яны там, што бачаць?
Чаго ўсё дрыжаць і дрыжаць?..

* * *

Цветы последние милей
Роскошных первенцев полей.

*А. Пушкин*

Плакала лета, зямлю пакідаючы;
Ціха ліліся слязінкі на поле.
Але прыгожаю восенню яснаю
Там, дзе упалі яны, выраслі
Кветкі асеннія, кветкі, ўспаённыя
Тугаю, горам, слязінкамі лета.
Кветкі асеннія, родныя, бледныя!
Выраслі вы, каб ураз жа і згінуць.
Можа таму-то душа надарваная
Гэтак любоўна вянок з вас сплятае.

